предмет и рассмотреть его с обратной стороны. Пользователь может «шагнуть» в виртуальное пространство, вооружившись «информационным костюмом», «информационной перчаткой», «информационными очками» и другими приборами. При работе с системами «виртуальной реальности» происходит качественное изменение восприятия информации. Восприятие происходит не только с помощью зрения и слуха, но и с помощью осязания и даже обоняния. Такая технология развивает пространственное мышление и позволяет наглядно работать с информацией.

Современные технологии открывают новые, широкие возможности для работы с информацией как в сфере образования, так и в сфере культуры.


*1. Носкова, Т. Н.* Аудиовизуальные технологии в образовании / Т. Н. Носкова. – СПб. : СПбГУКиТ, 2004. – 149 с.

*2.* Аудиовизуальные средства обучения – [Электронный ресурс] / Лаборатория ТСО и медиаобразования РАО. – Режим доступа : http://mediaeducation.ru/71/2349-1-audiovizual-nye-sredstva-obuch/. – Дата доступа : 15.11.2015.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ


***Т. М. Мармыш,***
*выкладчык кафедры*
*міжкультурных камунікацый*


# НЕМАТЭРЫЯЛЬНАЯ КУЛЬТУРНАЯ СПАДЧЫНА: МОДУЛЬ ІНТЭРЛАКАЛЬНАСЦІ

Нематэрыяльная культурная спадчына ў сваім традыцыйным разрэзе як сістэма вусных духоўных практык, звязаных са светапоглядам і ўяўленнямі аб навакольным асяроддзі, спробай яго асэнсавання, найперш носьбітамі такой спадчыны, знаходзіцца ва ўзаемасувязі з лакальнай ідэнтычнасцю, месцам, культурным ландшафтам – феноменамі, па сутнасці, аб'яднанымі паводле сацыякультурнага значэння геаграфічна-тэрытарыяльнага вымярэння быцця чалавека. З такой прычыны нематэрыяльная культурная спадчына (НКС) як аб'ект вывучэння знаходзіцца не толькі ў фокусе ўжо звыклых для яе навук (культуралогіі, этналогіі, культурнай і сацыяльнай антрапалогіі), але і гуманітарнай геаграфіі (human geography), пера-

думовы ідэі якой можна прасачыць, пачынаючы ад міждысцыплінарнага асэнсавання школай аналаў гісторыі, у тым ліку і праз геаграфічны дэтэрмінізм [2, с. 83], антрапагеаграфіі і геапалітыкі Ф. Ратцэля [5], «геаграфіі чалавека» і пасібілізму П. Відаля дэ ла Блаша [8], харалогіі А. Гетнера [3], «культурнага ландшафту» К. Заўэра [10] пачатку XX ст.

Вызначаемыя сёння за кампліментарныя, праекцыі культуры на натуральны ландшафт і прыроды на прастору культуры маюць дачыненне да прасторава-тэрытарыяльнага лакалізму нематэрыяльнай культуры і яе ўзаемазалежнасці з культурным ландшафтам, што стварае аснову для дыверсіфікацыі праяў НКС.

Апроч геалакалізму, істотна ўплываюць на функцыянальнасць нематэрыяльнай культуры і такія яе ўніверсальныя характарыстыкі, як тэмпаральнасць і сацыяльная матываванасць. Названыя параметры змяняюцца пад уздзеяннем атрыбутыўных для грамадства *радыкалізаванага мадэрна* (radicalized modernity) [6, p. 27] інфармацыйна-камунікатыўных кампанентаў і медыізацыі, трансфармуюцца, тым самым павышаючы ўзровень адаптыўнасці нематэрыяльнай культуры. Пры гэтым размываюцца падставы аўтэнтычнасці нематэрыяльных форм культуры якія ў большасці выпадкаў набываюць другасныя формы, падвяргаюцца знешнім уздзеяннем нармаванасць і рэгламентаванасць зместу практык НКС – сукупнасці ведаў аб канкрэтных формах увасаблення такой спадчыны.

На фоне крызісу прадметнага асяроддзя, адсутнасці дастатковай колькасці часу для гарманізацыі яго новых складнікаў, што пастаянна дадаюцца [4, с. 61], назіраецца страта лакальнасці НКС у прасторава-тэрытарыяльным сэнсе, акцэнт пераносіцца на лакальнасць сімвалічную, асваенне новых (магчыма, таксама толькі часовых) кантэкстаў-топасаў за межамі першасных, абазначаных трыядай «тэмпаральнасць – прастора – матывацыя», на глебе чаго ўзнікае модуль інтэрлакальнасці НКС, выражаны ў двух асноўных вектарах.

*Суб'ектныя практыкі інтэрлакальнасці НКС* грунтуюцца на фізічным адрыве асобы-носьбіта нематэрыяльнай культурнай спадчыны ад локуса генезісу такой спадчыны, што суправаджаецца працэсамі акультурацыі. Ім уласцівы тры асноўныя тыпы рэакцый прадстаўніка культуры – рэцыпіента на непасрэдны працяглы кантакт з наступнымі зменамі культурных патэрнаў у адной або абедзвюх кантактных культурах:



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

А. Прынццe: засвойванне большай часткі патэрнаў іншай культуры і страты асноўнага масіву найстаражытнейшага пласта культурнай спадчыны, а таксама асіміляцыя на паводзінным і каштоўнасным узроўнях.

Б. Адаптацыя: частковая змена арыгінальных традыцыйных патэрнаў пад уплывам культуры-донара такім чынам, каб утвораная культурна-гістарычная мазаіка функцыянавала цэласна з магчымым захаваннем пэўных супярэчлівых з'яў, тым не менш, здольных суіснаваць у паўсядзённым жыцці.

С. Рэакцыя: непрыняцце патэрнаў культуры-донара, узнікненне рухаў контракультурацыйнага плана, у тым ліку на кампенсацыйнай падставе мяркуемай непаўнавартасці ці наадварот – прэстыжу – прыналежнасці да культуры-рэцыпіента [9, p. 152].

Кожны з тыпаў можа рэалізоўвацца самастойным адзінкавым кейсам, альбо стаць грунтам да больш «радыкальнай» ступені акультурацыі па-за мацярынскай культурай. Гэта можа ажыццяўляцца на мікра- і макраўзроўнях (ад перамяшчэння ў суседні рэгіён у межах краіны і да змены кантынента). Адпаведна, нематэрыяльная культура ў пазначаным дыяпазоне можа рэактуалізавацца праз культуртрэгерскую дзейнасць актыўных яе носьбітаў і ўключацца ў новы мясцовы кантэкст, захоўвацца ў культурнай памяці носьбітаў, альбо выконваць ролю «культуры дыяспары». Развіццё апошняга варыянта, за рэдкім выключэннем, упісваецца ў геавобразную мадэль стасункаў «цэнтр – перыферыя» з адпаведным памяншэннем выразнасці семіятычнага зместу: ад жывой НКС да дэманстратыўных другасных (напрыклад, сцэнічных) форм.

*Аб'ектныя практыкі інтэрлакальнасці НКС.* Наданне сэнсаў інтэрлакальнасці адбываецца, калі нематэрыяльная культура выходзіць за межы жывога натуральнага бытавання вясковага ці гарадскога па паходжанні, у т. л. аўтаномна ад носьбіта пры яе фіксацыі і дакументаванні. НКС тут выступае ў значэнні аб'екта інтэрпрэтацыі і рэпрэзентацыі знешнімі суб'ектамі.

На першы план у дадзеным выпадку выходзяць медыялізацыя і візуалізацыя інфармацыйных плыняў праз сродкі масавай камунікацыі. WWW з'яўляецца інструментам рэпрэзентацыі нематэрыяльнай культуры на тэматычных рэсурсах сродкамі аўдыявізуальнай і тэкставай інфармацыі. Інтэрпрэтацыя і, як вынік, апрадмечванне нематэрыяльнай спадчыны адбываец-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ца праз формы мастацкага асэнсавання, прадстаўленымі знешняй фіксацыяй і тэхнічным тыражаваннем мастацкай прадукцыі [1, с. 46] – у фатаграфіі, літаратуры, выяўленчым і экранным мастацтвх, музыцы, якія ў сваёй сукупнасці масава скіраваныя. Адпаведныя камунікатаўныя працэсы, што маюць месца пры «спажыванні» такога прадукту, набываюць рэтыальны сеткавы характар, у адрозненне ад аксіяльнай мадэлі камунікацыі «face-to-face», уласцівай НКС у традыцыйным культурным ландшафце.

Дадзены вектар спрыяе падтрымцы даступнасці і каштоўнаснага рэлятывізму НКС. Забеспячэнне даступнасці нематэрыяльнай культурнай спадчыны – магчымасць любой зацікаўленай асобы ўключыцца ў кантэкст яе жыццядзейнасці – не павінна абмяжоўваць правы носьбітаў НКС, у тым ліку на ідэнтыфікаванне НКС належнай толькі супольнасці, у праксемічным плане не ўключаючай грамадскага ўзроўню перадачы інфармацыі (паводле класіфікацыі міжсуб'ектых зон камунікацыі Э. Холла [7, р. 123]). У аснове каштоўнаснага рэлятывізму НКС ляжаць самакаштоўнасць і самаідэнтычнасць любых практык апошняй, незалежна ад статусна-колькасных паказчыкаў носьбітаў (супольнасцяў) і, тым болей, параўнальна-ацэначных метадаў вызначэння «дыхтоўнасці» НКС той ці іншай супольнасці.

Вобразна-сімвалічная рэпрэзентацыя, канвертаванне сэнсаў праз свядомасць і для свядомасці XXI ст. – аснова музейнай камунікацыі вакол нематэрыяльных з'яў культуры, паколькі менавіта камунікатыўны падыход пераважае ў дзейнасці сучаснага музея як культуратворчага інстытута, што пашырыў традыцыйную канцэпцыю захавання і даследавання спадчыны.

Асаблівую ролю ў інтэрпрэтацыі НКС мае дзейнасць міжнародных арганізацый. UNESCO, ICOM, ICOMOS, ICCROM, CEMAT, Савет Еўропы сродкамі нарматворчай дзейнасці, праграмных дакументаў вызначаюць кіруючыя падыходы да пытання спадчыны. Europa Nostra, R.E.D., George Town World Heritage Inc. ды інш. праз лабіраванне ўстойлівых стратэгій развіцця матэрыяльнай і нематэрыяльнай спадчыны ствараюць пляцоўку для дыскусій спецыялістаў, асацыяцый, НДА, заснаваных на імператыве яе захавання.

Такім чынам, можна меркаваць аб наяўнасці тэндэнцыі да ўзмацнення камунікатыўнага характару НКС. Камунікатыўнае

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вымярэнне НКС прадвызначае дыялагічны патэнцыял апошняй у кантэксце страты геалакальнасці і набыцця новай экстратэрытарыяльнай абумоўленасці.

1. *Алексеев, Э.* Фольклор в контексте современной культуры : рассуждения о судьбах народной песни / Э. Алексеев. – М. : Советский композитор, 1988. – 237 с.

2. *Блок, М.* Апология истории, или Ремесло историка / М. Блок. – М. : Наука, 1986. – 254 с.

3. *Геттнер, А.* География. Её история, сущность и методы / А. Геттнер, М. ; Ленинград : Государственное издательство, 1930. – 416.

4. *Мастеница, Е. Н.* Наследие в музее : границы и горизонты интерпретации / Е. Н. Мастеница // Музей и нематериальное культурное наследие : сб. тр. – М., 2005. – Вып. 6. – С. 60–64.

5. *Ратцель, Ф.* Человечество как жизненное явление на земле / Ф. Ратцель. – М. : URSS : Либроком, 2011. – 56 с.

6. *Giddens, A.* Social Theory and Modern Sociology / A. Giddens. – Stanford : Stanford University Press, 1987. – 310 p.

7. *Hall, E.* Distances in Man / E. Hall // The Hidden Dimension. – Garden City, N.Y. : Doubleday, 1966, P. 113–129.

8. *Holt-Jensen, A.* Geography: History and Concepts / A. Holt-Jensen. – London : SAGE, 1999. – 228 p.

9. *Redfield, R.* Memorandum for the Study of Acculturation / R. Redfield, R. Linton, M.J. Herskovits // American Anthropologist. – 1936. – Vol. 38, No. 1. – P. 149–152.

10. *Sauer, C.* The Morphology of Landscape / C. Sauer // Land and Life : A Selection from the Writtings of Carl Ortwin Sauer / edited by J. Leighly. – Los Angeles, London : University of California Press, 1983. – 435 p.

***А. І. Марэцкі,***
*кандыдат філасофскіх навук, дацэнт,*
*прафесар кафедры філасофіі*

## НЕКАТОРЫЯ АСПЕКТЫ ФАРМІРАВАННЯ ТАЛЕРАНТНАСЦІ Ў СУЧАСНЫХ УМОВАХ

Апошнія стагоддзі з’явіліся яркай дэманстрацыяй надзвычай супярэчлівай чалавечай натуры. Менавіта ў гэты час, з аднаго боку, чалавецтва здзейсніла значныя навуковыя адкрыцці. З іншага боку, у гэты ж час былі развязаны самыя жорсткія войны, адбыліся сацыяльныя перавароты, якія выклікалі, у сваю чаргу, жорсткія формы эксплуатацыі людзей, знявагу да іх

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ